# ВЯЛІКІ ЕЎРАПЕЙСКІ ГОЛАД (1315–1317 ГГ.)

*А.А. Субоцін*
*Віцебск, ВДТУ*

Змена клімату з'яўляецца адной з вострых праблем сучаснага грамадства і патрабуе свайго падрабязнага вывучэння ў гістарычнай рэтраперспектыве. Перыяд Сярэднявечча выступае ў гэтым сэнсе адметнай эпохай. У апошнія стагоддзі сярэдніх вякоў назіраліся шматлікія кліматычныя катаклізмы так званага Малога ледавіковага перыяду, якія вельмі часта выклікалі крызісы харчавання, дзе асобна вылучыўся голад 1315–1317 гг.

Адзначаны голад з'яўляўся адным з самых сур'ёзных бедстваў Позняга Сярэднявечча, а таксама найбольш дакументальна пацверджаным. Прычынамі голаду стала экстрымальна вільготнае і дажджлівае надвор'е. Праліўныя дажджы распаўсюдзіліся ў сярэдзіне 1310-х гг. па ўсім кантыненце. Гэты перыяд супаў з незвычайна высокімі тэмпературамі паверхні мора ў Паўночнай Атлантыцы, што стварыла атмасферныя ўмовы, якія спрыялі экстрымальна вільготнаму, прахалоднаму і штармавому надвор'ю па ўсёй Еўропе ў сярэдніх шыротах [8, р. 496].

Напрыклад, у Англіі, па сведчанні гісторыка Ф. Славіна з Універсітэта Стэрлінга, моцныя ліўні пачаліся летам 1314 г. і працягваліся амаль да лістапада. Гэта прывяло да немагчымасці праводзіць сяўбу азімых культур. Дажджлівае надвор'е таксама назіралася вясной і летам 1315 г., замінаючы касьбе і збору ўраджаю. Дажджы суправаджаліся моцнымі парывамі ветру і навальніцамі. Зіма і вясна 1316 г. былі празмерна дажджлівымі і штармавымі. Вільготнае надвор'е захоўвалася і летам гэтага года, калі ліўні былі настолькі моцныя, што ў некаторых месцах палі да часу збору ўраджаю цалкам апынуліся пад вадой. Падчас збору ўраджаю дажджы спыніліся і надвор'е стала сухім. Зіма 1317 г. была халоднай і снежнай і доўжылася да канца сакавіка, што негатыўна адбілася на высяванні насення [8, р. 497–498]. Толькі вясной 1317 г. кліматычныя катаклізмы ў Англіі ў выглядзе экстрымальна вільготнага і халоднага надвор'я скончыліся [6, р. 284].

Тагачасныя пісьмовыя крыніцы апавядаюць, што падобная сітуацыя назіралася ў цэлым па ўсёй Заходняй Еўропе, дзе на працягу 24 месяцаў з ліпеня 1314 г. па ліпень 1316 г. назіраліся ўмовы надвор'я, якія характарызаваліся амаль бесперапыннымі праліўнымі дажджамі летам, восенню і вясной, а затым замаразкамі зімой [8, р. 495].

Неспрыяльна вільготнае надвор'е сярэдзіны 1310-х гг. таксама пацвярджаецца дадзенымі дэндрахраналогіі. На аснове звестак архіва Нацыянальных цэнтраў экалагічнай інфармацыі ЗША аб кольцах дрэў былі рэканструяваныя схемы выпадзення ападкаў на вялікай тэрыторыі, якая

ўключае Еўропу, Паўночную Афрыку і Блізкі Усход. Згодна з гэтымі дадзенымі, найбольшая вільготнасць была зафіксавана ў 1315 г. у межах арыентаванага з захаду на ўсход пояса паміж 43° і 58°, які цягнецца ад Каталоніі да Заходняй Расіі [7].

Незвычайна сырое і халоднае надвор'е адначасова знішчыла практычна ўсе галіны гаспадаркі еўрапейскага кантынента сярэдніх шырот. У прыватнасці такое надвор'е наносіла шкоду сабранаму ўраджаю з-за гніення і прарастання збожжа. У дадатак да неспрыяльных умоў захоўвання ўраджаю назіраўся рост транспартных выдаткаў, паколькі перавозкі з выкарыстаннем цяглай сілы сталі больш працаёмкімі і дарагімі, таму што бесперапынныя праліўныя дажджы пераўтварылі дарогі ў суцэльную багну [3, р. 20].

Дажджлівае надвор'е і холад мелі сур'ёзныя наступствы і для жывёлагадоўлі. Праліўныя дажджы не дазвалялі сельскім гаспадарам хутка высушыць сена, а таксама рабілі скошванне пашы надзвычай цяжкім і дарагім. Сена, пакінутае на некалькі дзён пад дажджом, губляла большую частку сваёй спажыўнай каштоўнасці для хатняй жывёлы. У многіх выпадках гніенне сена спрыяла распаўсюджванню паразітаў, што выклікалі, у сваю чаргу, хваробы буйной рагатай жывёлы [8, р. 499].

Неспрыяльныя ўмовы для вядзення земляробства і жывёлагадоўлі прыводзілі ў выніку да катастрафічнага недаходу харчавання для большай часткі насельніцтва еўрапейскіх краін. Пік абвастрэння харчовых праблем прыйшоўся на перыяд 1315–1317 гг., што і стала падставай для яго вызначэння ў працах па гістарычнай кліматалогіі пад назвай "Вялікага еўрапейскага голаду".

Вялікі еўрапейскі голад закрануў Іспанію, Францыю, Вялікабрытанію, Ірландыю, Нідэрланды, германскія землі, скандынаўскія краіны, Багемію і Польшчу. Цэны на пшаніцу ў Англіі, Францыі, Германіі і краінах Бенілюкса былі прыкладна ў тры разы вышэй, чым у папярдіня гады, калі не было голаду. Пры гэтым на мясцовыя рынкі паступала вельмі мала збожжа. Гэта было звязана не толькі з неўраджаямі хлеба, але і з нежаданнем большасці вытворцаў выстаўляць свае запасы збожжавых на продаж [6, р. 286]. Так, на поўдні Англіі ў выніку неўраджаяў пастаўкі зерня на рынак скараціласа на 40 % у 1315 г. і на 45 % у 1316 г.. На поўначы краіны, больш халодным і вільготным, вытворчасць збожжавых па асобных маёнтках упала ў 1315–1316 гг. ад 30 да 80 % [5, р. 39]. Таксама ў цэлым па Заходняй Еўропе з канца 1315 г. адбываўся рэзкі рост коштаў на харчовыя тавары жывёльнага паходжання, такія, як сыр і сметанковае масла, сала і тлушчараспушчальныя прадукты, а таксама яйкі [3, р. 58].

З дакументаў вельмі цяжка вызначыць колькасныя страты насельніцтва па выніках Вялікага голаду ва ўсёй Еўропе. Такую інфармацыю мы можам канстатаваць па прыкладных падліках толькі ў

адносінах да асобных краін ці рэгіёнаў. Напрыклад, нісьмовыя дадзеныя па эканамічнаму стану маёнткаў Англіі паказваюць, што насельніцтва гэтай краіны скарацілася на 10–15 % за перыяд з 1315 па 1318 гг. [8, р. 504]. На тэрыторыі сучаснай Бельгіі голад прывёў да скарачэння гарадскога насельніцтва прыкладна на 10 %, а сельскія раёны пацярпелі яшчэ больш [6, р. 286]. У прыватнасці ў фламандскім горадзе Іпр з насельніцтвам каля 30 000 чалавек з мая 1316 г. па кастрычнік 1316 г. памерла як мінімум 2 794 чалавека. Максімальная колькасць смерцяў была зафіксавана ў маі – жнівені 1316 г., калі лічба ахвяраў голаду складала ў сярэднім 160 чалавек на тыдзень [5, р. 42].

Вялікі еўрапейскі голад закрануў таксама і беларускія землі, частка якіх уваходзіла на той час у склад Вялікага княства Літоўскага. У Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай голад упамінацца на тэрыторыі Польшчы, Літвы і Русі. Аўтар хронікі адзначае, што падчас яго людзі былі даведзены да таго, што вырывалі і елі карэнні з зямлі, елі трупы памерлых, таксама прыбягалі да канібалізму, калі бацькі вымушаны былі есці сваіх дзяцей. Хроніка ўпамінае пра выпадкі нападаў і забойстваў людзей дзеля здаволення голаду [1, с. 35]. Голад, апісаны ў Хроніцы, як і па ўсёй Еўропе, меў зацяжны характар і працягваўся два гады.

Пачатак голаду быў указаны хранiстам памылкова пад 1320 г. На самой справе крызіс харчавання прыпадае як раз на 1315–1317 гг.. Справа ў тым, што пры ўпамінанні голаду анісвалася і з’яўленне на небе дзвюх камет на Каляды [1, с. 35]. Абсалютна такую ж інфармацыю пра голад і каметы мы можам знайсці ў кнізе Я. Длугаша “Аналы, або хронікі вялікіх каралёў Польшчы”, а таксама ў Хроніцы польскай М. Бельскага, дзе адзначаецца, што каметы былі бачны на небе ў 1314 г., а голад настаў у 1315 г [2, р. 91; 4, s. 214].

Такім чынам, неспрыяльныя кліматычныя ўмовы ў сярэдніх шыротах еўрапейскага кантынента сярэдзіны 1310-х гг. выклікалі адзін з катастрафічных голадаў Сярэднявечча. Экстрамальна дажджлівае і вільготнае надвор’е, якое прыпадала на вегетацыйны перыяд, выклікала значнае скарачэнне ўраджаю збожжавых культур і падзенне ўзроўню вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі, што адпаведна прывяло да павышэння цэнаў на рынках сельскагаспадарчых тавараў. Зніжэнне ўзроўню забяспечанасці прадуктамі харчавання прывяло да крызісу спажывання і галодных смерцяў, якія закранулі як сельскае, так і гарадское насельніцтва Еўропы.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Полное собрание русских летописей / Институт истории СССР. – М. : Наука, 1975. – Т. 32 : Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного. – 233 с.

2. Dlugossi, I. Annales seu cronicae incliti regni Poloniae. Liber nonus / I. Dlugossi. – Varsavie : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1978. – 509 p.

3. Jordan, W. C. The Great Famine. Northern Europe in the Early Fourteenth Century / W. C. Jordan. – Princeton : Princeton Univ. Press, 1996. – 328 p.
4. Kronika Polska Marcina Bielskiego. Nowo przez Ioach. Bielskiego, syná iego, wydána. – Kraków : w drukárni Jákubá Sibeneycherá, 1597. – 804 s.
5. Le Roy Ladurie, E. Histoire humaine et comparée du climat. Canicules et glaciers XIIIe–XVIIIe siècles / E. Le Roy Ladurie. – Paris : Fayard, 2004. – 740 p.
6. Pfister, C. Climate and society in Europe – the last thousand years / C. Pfister, H. Wanner. – Bern : Haupt verlag, 2021. – 396 p.
7. Old World Drought Atlas [Electronic resource] // National Centers for Environmental Information. – Mode of access: https://www.ncei.noaa.gov/access/paleo-search/study/19419. – Date of access: 26.09.2024.
8. Slavin, F. The 1310s Event / F. Slavin // The Palgrave Handbook of Climate History / ed. S. White, C. Pfister, F. Mauelshagen. – London, 2018. – P. 495–515.